***Л. І. Доўнар,***
*кандыдат педагагічных навук,*
*прафесар кафедры тэорыі і гісторыі ІДК*

# АСНОЎНЫЯ РЫСЫ І ТЭНДЭНЦЫІ КНІГАВЫДАННЯ БЕЛАРУСІ (1991–2014) У КАНТЭКСЦЕ РАЗВІЦЦЯ СУЧАСНАГА КНІГАЗНАЎСТВА

Пытанням сучаснага стану кнігавыдання ў Беларусі быў прысвечаны шэраг нашых публікацый – артыкулы, раздзелы ў манаграфіі «Кніжнасць новай Беларусі (XIX–XXI стст.)» (Мінск, 2011), вучэбным дапаможніку «Гісторыя беларускай кнігі» (Мінск, 2012). Канцавой датай дадзеных матэрыялаў з'яўляецца 2010 год, таму, зразумела, патрэбны новыя дапаўненні. Адначасова неабходна і пераасэнсаванне кнігавыдавецкай дзейнасці ў кантэксце працэсу бесперапыннай адукацыі, што ў сваю чаргу цесным чынам звязана з такімі глабальнымі пытаннямі, як здароўе грамадства – духоўнае, маральнае.

Ці ў стане навука (у тым ліку пра кнігу) узяць адказнасць і паставіць перад сабой задачу гуманізацыі грамадства, ажыццявіўшы на практыцы сістэмныя змены ў трыумвіраце, у які сама і ўваходзіць: «навука – культура – адукацыя»?

Як лічыць А. В. Сакалоў, вырашэнне праблемы гуманізацыі грамадства – «цель книговедческой науки и практики, информационно-компьютерные технологии – средства достижения этой цели» [1, с. 29]. Г. М. Швяцова-Водка, якая таксама, як і Сакалоў, кампрамісы спрабуе адшукаць яшчэ і ў канструяванні тэарэтыка-метадалагічных мадэляў навуковых ведаў, засноўваючыся на тэорыі сацыяльнай інфармацыйнай камунікацыі [5, с. 21], хоць і скептычна ўспрымае дадзенае палажэнне гуманізацыі (Расіі), тым не менш, удакладняе, што «<…> цель должна быть поставлена прежде всего перед политиками, государственными деятелями, в том числе руководителями книжного дела и народного образования. А библиологические науки должны способствовать выяснению путей и способов осуществления этой благородной задачи» [5, с. 23].

Дыскусія, разгорнутая апошнім часам, дзякуючы К. М. Сухарукаву [2; 3], на старонках вядомага навуковага выдання «Книга. Исследования и материалы» (2012–2014), на наш погляд, павінна стаць не толькі дыскусіяй дзеля дыскусіі і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пацвердзіць жыццядзейнасць навуковых ведаў кнігазнаўства, бібліялогіі, а таксама стымуляваць да вырашэння сур'ёзных праблем як кніжнай справы і культуры, так і адукацыі, у якіх менавіта дзяржаве трэба выступаць самым зацікаўленым і адказным сістэмным суб'ектам-арганізатарам, а не толькі дэкларатыўным саюзнікам навукі – культуры – адукацыі на шляху да гуманізацыі грамадства.

Такім чынам, сёння даследчая прастора кнігазнаўства пераходзіць на іншы ўзровень (узроўні) асэнсавання, асноўнай характарыстыкай якога з'яўляецца, як слушна прадстаўляе А. В. Сакалоў, «многомерность», шматмернасць як структуры, так і ўзаемасувязяў усіх элементаў – цалкам сістэмы. Адпаведна, кнігазнаўства (бібліялогія), як прапануе Сакалоў, – структураваная сістэма фундаментальных і прыкладных ведаў, размеркаваных па навуковых дысцыплінах у залежнасці ад узроўню лагічнага абагульнення.

Найбольш значнай сістэмай, якая пераводзіць кніжныя веды з грамадскіх у індывідуальныя каштоўнасці, з'яўляецца сфера адукацыі і выхавання. Аднак у гэтай сферы, як адзначаюць сучасныя кнігазнаўцы, здарыўся «<…> "сбой" в культурной эстафете поколоений – не только и не столько из-за разницы интересов и моделей чтения "отцов" и "детей", сколько вследствие деградации школьного и вузовского преподавания, особенно гуманитарных предметов, <…> люди перестали стыдиться своего невежества» [3, с. 52].

Адначасова, у педагогіцы ў якасці навуковых механізмаў разглядаюцца, напрыклад, наступныя: культуралагічны падыход як метадалагічная аснова пры распрацоўцы зместу выхавання, гуманізацыя і фундаменталізацыя зместу адукацыі на аснове міждысцыплінарнага падыходу [4].

Атрыманыя вынікі паводле даследавання чатырох этапаў сучаснага кнігавыдання прадстаўляюць яскравую карціну азначаных праблем, для якіх характэрны наступныя рысы і тэндэнцыі.

1. 1991–1996 гг. у сучасным кнігавыданні Беларусі правамерна ахарактарызаваць як першы этап абноўленага кнігавыдання. Найважнейшымі фактарамі, якія паўплывалі на змены ў сферы кнігавыдання сталі, наступныя:

– высокая чытацкая запатрабаванасць перыяду «перабудовы»;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– дэмакратызацыя грамадства, свабода слова і друку, хваля раскрыцця, адкрытасці і даступнасці раней забароненай інфармацыі;

– адносна танныя выдаткі на выдавецкую дзейнасць;

– невысокая канкурэнцыя.

Характэрнымі тэндэнцыямі выступаюць:

– дэманапалізацыя дзяржаўнага кнігавыдання;

– арганізацыя дзейнасці выдавецтваў прыватнага характару;

– актыўнае перавыданне нацыянальнай кніжнай спадчыны;

– задавальненне патрэб кніжнага рынку, кан'юнктуры масавага чытацкага попыту;

– колькасны рост назваў і накладу выданняў, у тым ліку на беларускай мове;

– структурныя змены ў выдавецкай сферы, якія садзейнічалі рэфармаванню і стварэнню сістэмы рыначных адносін у кнігавыданні.

2. 1997–2001 гг. у сучасным кнігавыданні Беларусі правамерна ахарактарызаваць як другі яго этап. Найважнейшыя фактары наступныя:

– змена сацыяльна-палітычнай сітуацыі ў краіне;

– крызіс дэмакратычных інстытутаў у грамадстве;

– часовы характар дзяржаўных ільгот для прыярытэтных напрамкаў нацыянальнага кнігавыдання;

– неабароненасць нацыянальнага кніжнага рынку;

– рост цэн на паліграфічныя паслугі і матэрыялы, адсутнасць інвестыцый у вытворчую сферу, недаступнасць крэдытавання;

– спад пакупніцкай здольнасці насельніцтва, падатковы ціск.

Праяўляюцца новыя рысы:

– нестабільнасць у сектары дзяржаўнага кнігавыдання;

– узмацненне дзяржаўнага рэгулявання кнігавыдання і рынку кніжнай прадукцыі ў цэлым;

– пошук недзяржаўнымі выдавецтвамі адаптацыйных магчымасцяў працы;

– пераарыентацыя кніжнага рынку на расійскія выданні;

– зніжэнне колькаснага росту назваў і накладу выданняў, у асноўным на беларускай мове.

3. 2002–2007 гг. – трэці этап кнігавыдання пад умоўнай назвай «На шляху да якаснай мадэлі кніжнай вытворчасці». Асноўнымі рысамі выступаюць:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– спад колькасных паказчыкаў па тыражы і па назвах у сектары як дзяржаўнага, так і недзяржаўнага кнігавыдання;

– зніжэнне ўзроўню рэнтабельнасці дзяржаўных выдавецтваў і зліццё апошніх;

– далейшае падзенне паказчыкаў выпуску кніг на беларускай мове ў дзяржаўным сектары;

– далейшае ўзмацненне дзяржаўнага рэгулявання кнігавыдання і адначасова недастатковасць у садзейнічанні развіццю айчыннага рынку кніжнай прадукцыі;

– скарачэнне субсідзіравання сацыяльна значнай літаратуры з дзяржбюджэту;

– пашырэнне колькасці назваў малатыражнай літаратуры;

– стварэнне электронных кніг і іх распаўсюджанне праз сайты выдавецтваў і інтэрнет-крамы;

– канцэнтрацыя кніжнай вытворчасці ў адным або некалькіх найбуйнейшых выдавецтвах.

4. 2008–2014 гг. – чацвёрты этап кнігавыдання пад умоўнай назвай «Ва ўмовах эканамічнага крызісу». Характэрныя рысы кнігавыдання ў гэты час:

– рэзкая і адмоўная рэакцыя сферы кнігавыдання на эканамічны крызіс у пачатку этапа – спад агульных колькасных паказчыкаў па сукупным тыражы і па назвах у сектары як дзяржаўнага, так і недзяржаўнага кнігавыдання;

– падзенне лістажу друкаваных кніг – паказчык, што сведчыць аб аб'ёмах загрузкі паліграфічных прадпрыемстваў краіны, якія выпрабоўваюць на сабе ціск такіх фактараў, як агульнаэканамічны крызіс;

– пошук унутраных рэсурсаў і некаторы рост колькасных паказчыкаў назваў малатыражных выданняў: ведамасных, ВНУ, вытворчых, у тым ліку навуковых (манаграфій, навуковых зборнікаў, матэрыялаў канферэнцый), сярод якіх і рост агульнай колькасці назваў навуковых кніг;

– пачатак працэсу аптымізацыі нацыянальнага кнігавыдання: ад самых нізкіх паказчыкаў выпуску кніг на беларускай мове да паступовага іх росту;

– далейшае выкарыстанне рычагоў дзяржаўнага рэгулявання кнігавыдання і адначасова недастатковасць апошняга ў садзейнічанні развіццю айчыннага рынку кніжнай прадукцыі;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– далейшае развіццё электроннага кнігавыдання, тэхналогій лічбавага друку і электроннай камунікацыі праз сайты выдавецтваў і інтэрнет-крамы.

Выдзеленыя і даследаваныя чатыры этапы сучаснага кнігавыдання ў Беларусі дазваляюць, такім чынам, прадставіць яго характэрныя або спецыфічныя рысы, якія знаходзяцца пад уплывам сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных фактараў і праяўляюцца нават на такіх кароткіх часавых адрэзках у шэрагу адзначаных тэндэнцый. У цэлым жа, як відаць, дадзены перыяд беларускага кнігавыдання з'яўляецца пераходным, аднак яму ўласцівы і такія агульнасусветныя тэндэнцыі, як: 1) развіццё і прымяненне новых тэхналогій, 2) распрацоўка навукова-тэхналагічных асноў кніжнай справы, 3) манапалізацыя кніжнай справы, 4) інтэграцыя ў сусветную прастору.

Адначасова сярод негатыўных праяў неабходна адзначыць адсутнасць канцэптуальных перспектыў развіцця кнігавыдання ў адпаведнасці з патрабаваннямі новага часу, асабліва ў галіне навукі і адукацыі. Імпакт-фактар, які прад'яўляецца да выданняў, набывае шмат у чым фармальны характар і можа негатыўна адбіцца на далейшым стане навукі і адукацыі. Матэрыяльны бок у кнігавыданні, а значыць, і таварная функцыя кнігі ўсё больш паглынаюць іншыя функцыі. Пад пагрозай аказваюцца такія сферы, як навука, адукацыя, выхаванне, культура, якія пераводзяць кніжныя веды з грамадскіх у індывідуальныя каштоўнасці. Застаюцца адкрытымі пытанні: якім чынам павінны быць уключаны ва ўсе гэтыя працэсы кніга, кнігавыданне і кніжная справа, як умацаваць сацыяльны прэстыж кнігі і кніжнай камунікацыі.

Каб вырашыць на практыцы акрэсленае кола праблем, неабходна міждысцыплінарнае ўзаемадзеянне і дзяржаўнае рэгуляванне дадзенымі працэсамі, якія сёння павінны быць накіраваны на гуманізацыю грамадства. Інавацыйныя змены шмат у чым залежаць ад інтэграцыйнай дзейнасці дзяржавы – навукі – культуры – адукацыі, што можа з’яўляцца, на наш погляд, стратэгічнай воссю канцэпцыі развіцця і сучаснага кнігавыдання.

---

1. *Соколов, А. В.* Многомерная структура книговедческого знания / А. В. Соколов // Книга. Исследования и материалы. – М., 2012. – Сб. 98–99. – С. 13–29.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Сухоруков, К. М.* Вместе или порознь: о теории и практике книговедения / К. М. Сухоруков // Книга. Исследования и материалы. – М., 2012. – Сб. 95. – С. 5–23.

3. *Сухоруков, К. М.* Наше книговедение: теория, мечты и реалии / К. М. Сухоруков // Книга. Исследования и материалы. – М., 2014. – Сб. 101. – С. 48–59.

4. *Ушакова, В. М.* Приоритеты педагогической науки в сфере культуры / В. М. Ушакова // Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва : матэрыялы навук. канф., Мінск, 28 лістап. 2013 г. – Мінск : БДУКМ, 2014. – С. 191–196.

5. *Швецова-Водка, Г. Н.* Наука о книге в XXI в.: старые споры и новые проблемы / Г. Н. Швецова-Водка // Книга. Исследования и материалы. – Москва, 2013. – Сб. 99, ч. 3–4. – С. 21–23.

***А. А. Дорожко,***
*аспирант*

# МУЗЫКАЛЬНАЯ КУЛЬТУРА КАК ФАКТОР ФОРМИРОВАНИЯ ОБЩЕЧЕЛОВЕЧЕСКИХ ЦЕННОСТЕЙ У УЧАЩЕЙСЯ МОЛОДЕЖИ

Среднее специальное и высшее образование – это образовательная среда, где молодой человек обретает фундамент, на котором он на протяжении всей своей жизни будет воздвигать собственное «здание», свой мир, отличающийся от других, поскольку архитектор, создающий его, – особенная, неповторимая личность. Однако это здание должно гармонично вписываться в так называемую социальную архитектуру, возможно, даже стать образцом для нее.

Понятие «социальная архитектура» широко раскрыто в эссе «Гуманизм и современность» величайшим поэтом XX века О. Э. Мандельштамом. По его мнению, «бывают эпохи, которые говорят, что им нет дела до человека, что его нужно использовать как кирпич, как цемент, что из него нужно строить, а не для него. Социальная архитектура измеряется масштабами человека. Иногда она становится враждебной человеку и питает свое величие его унижением и ничтожеством <…> Но есть другая социальная архитектура, ее масштабом, ее мерой тоже является человек, но она строит не из человека, а для человека, не на ничтожестве личности строит она свое величие, а на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ